**23 лістапада 2022 г. - 75 гадоў з дня нараджэння ВІКТАРА УЛАДЗІМІРАВІЧА КРАСНАПРОШЫНА (1947), беларускага матэматыка, спецыяліста ў галіне матэматычнай кібернетыкі, тэарэтычных асноў інфарматыкі, прафесара, доктара тэхнічных навук**



Віктар Уладзіміравіч Краснапрошын нарадзіўся 23 лістапада 1947 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Бацька, Уладзімір Аляксеевіч Краснапрашын, быў ваенна-служачым. Маці, Ганна Мікітаўна, на той момант была хатняй гаспадыняй.

У раннім узросце Віктар разам з сям'ёй пераехаў з Кобрына ў Мар'іну Горку Пухавіцкага раёна, дзе прайшло яго дзяцінства і юнацтва. Вучыўся ў СШ № 2, вельмі любіў матэматыку, паралельна займаўся ў спартыўнай школе лёгкай атлетыкай, стаў кандыдатам у майстры спорту.

Закончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум (1966), служыў у Савецкай арміі (1966–1969). У 1974 годзе закончыў факультэт прыкладной матэматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Уся працоўная дзейнасць Віктара Краснапрошына звязана з БДУ, дзе ён працуе з 1974 года на пасадах стажора-выкладчыка, асістэнта, дацэнта, загадчыка кафедры.

У 1979 годзе В. У. Краснапрошын абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «Математическая кибернетика», атрымаў ступень кандыдата фізіка-матэматычных навук. У 1983 годзе яму прысвоена вучонае званне дацэнта. У 2007 годзе абараніў доктарскую дысертацыю па тэме «Теоретические основы и технологии построения систем распознавания по прецедентности» (спецыяльнасць «Теоретические основы информатики»). Доктар тэхнічных навук (2008), прафесар (2008).

Віктар Уладзіміравіч з'яўляецца навукоўцам у вобласці матэматычнай кібернетыкі і інфарматыкі. Кола навуковых інтарэсаў: распазнаванне вобразаў, штучны інтэлект, тэорыя прыняцця рашэнняў, інфармацыйна-камп'ютарныя тэхналогіі. Мае каля 300 навуковых прац, у тым ліку 7 кніг. Адзін з аўтараў манаграфій «Экспертные системы для персональных компьютеров» (1990), «Физические основы дистанционного

зондирования» (1991), «Жуан Абелье: художник и время» (2002) і інш. Вынікі яго навуковых даследаванняў дакладваліся на буйных міжнародных канферэнцыях і сімпозіумах.

В. У. Краснапрошын падрыхтаваў 14 кандыдатаў навук. Стажыраваўся ва ўніверсітэтах Германіі, Іспаніі і Фінляндыі. Для правядзення сумесных навуковых даследаванняў і абмену вопытам неаднараова выязджаў ва ўніверсітэты Германіі, Іспаніі, В’етнама.

Сіламі арганізаванай ім навукова-даследчай лабараторыі «Информационные технологии и компьютерная графика» на працягу шэрагу гадоў выконваюцца праекты па найважнейшых навукова-тэхнічных праграмах Расіі і Беларусі, у тым ліку: «Научные основы информационных технологий и систем», «Защита от чрезвычайных ситуаций», «Триада», «Космос – НТ», «Информатика и космос», «Мониторинг», «Недра» і інш. Распрацаваныя сістэмы ўкаранёны ў розныя арганізацыі і прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь. Інтэлектуальная камп’ютарная сістэма «Орта-Эксперт» выкарыстоўвалася медыцынскай службай зборнай каманды Беларуси пры падрыхтоўцы і непасрэдна ў перыяд правядзення Алімпійскіх гульняў у Пекіне.

Сёння Віктар Уладзіміравіч Краснапрошын - загадчык кафедры інфармацыйных сістэм кіравання факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. З’яўляецца замежным акадэмікам Іспанскай Каралеўскай Акадэміі эканомікі і фінансаў, акадэмікам Еўрапейскай Акадэміі дактароў. Член кіраўнікоў саветаў міжнародных навуковых асацыяцый (AEDEM, AMSE, SIGEF), Дзяржаўнага экспертнага савета Рэспублікі Беларусь па інфарматызацыі, вылічальнай тэхнікі і інфармацыйных тэхналогіях, экспертнага савета фонду фундаментальных даследаванняў НАН Беларусі па інфарматыцы, экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па тэхнічных навуках, савета па абароне доктарскіх дысертацый. Член рэдкалегій айчынных і замежных навуковых выданняў: «Вестник БГУ», «Информатика», «Таврический вестник информатики и математики», «Machine Graphics & Vision», «Fuzzy Economic Review», «Selguk Jornal of Applied Mathematics».

За ўклад у развіццё навукі і плённую педагагічную дзейнасць В. У. Краснапрошын узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», знакам «Заслужаны

работнік БДУ», медалём Францыска Скарыны (2015), падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь (2009); Ганаровай граматай НАН Беларусі (2010); Ганаровай граматай ВАК Рэспублікі Беларусь; Ганаровымі граматамі БДУ. 19 кастрычніка 2021 года Віктару Уладзіміравічу прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат.
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

***Працы В. У. Краснапрошына***

**Теоретические основы и технологии построения систем распознавания по прецедентности** : диссертация … доктора технических наук : 05.13.17 : защищена 20.12.2007 : утверждена 02.04.2008 / Краснопрошин Виктор Владимирович. — Минск, 2007.

**Модели с дискретными корректорами в задачах распознавания** : автореферат диссертации … кандидата физико-математических наук : 01.01.09 / Краснопрошин Виктор Владимирович; АН БССР, Ин-т математики. – Минск, 1979.

**Краснопрошин, В. В.** Визуализация динамических моделей на основе стандартных аппаратно-программных средств / Краснопрошин В. В., Мазовка Д. И. - Минск, 2009.

**Краснопрошин, В. В.** Жуан Абелье. Художник и время / В. В. Краснопрошин, Т. В. Краснопрошина. – Минск : Интернешил Транс-Кэпитал, 2002. - 192 с.

**Краснопрошин, В. В**. Исследование операций : учебное пособие / В. В. Краснопрошин, Н. А. Лепешинский. - Минск: БГУ, 2013. - 191 с. - (серия «Классическое университетское издание»).

**Краснопрошин, В. В.** О методе управления мультиструктурными системами на основе распознания и классификации / В. В. Краснопрошин, Е. П. Максимович. – Минск, 1994. – 58 с.

**V. Krasnoproshin.** Decision-Making in Economy and Management: Problems and Prospects / V. Krasnoproshin. - Barcelona: Royal Academy of Economy and Financial Sciences, 1999. - 118 p.

**Адзериха, К. С**. Физические основы дистанционного зондирования / Адзериха, К. С., Киселевский Л. И., Костюкевич С. Б., Краснопрошин В. В. – Минск : Университетское, 1991. - 294 с.

**Ватлин, С. И.** Проблема обучения понятиям в адаптивных системах искусственного интеллекта / С. И. Ватлин, В. В. Краснопрошин. – Минск : БелНИИТИ, Серия искусственный интеллект, 1991. - 44 с.

**Виссия, Х. Э. Р. М**. Принятие решений в информационном обществе : учебное пособие / Х. Э. Р. М. Виссия, В. В. Краснопрошин, А. Н. Вальвачев. – Санкт-Петербург : Лань, 2019. – 228 с. : ил. – (Учебники для вузов. Специальная литература).

**Кофман А.** Введение теории нечетких множеств в управлении предприятиями : пер. с испанского / Кофман А., Хил Алуха Х. ; под ред. В. В. Краснопрошина, Н. А. Лепешинского. – Минск : Вышэйшая школа, 1992. – 223 с.

**Кофман А.** Модели для исследования скрытых воздействиий : пер. с испанского / Кофман А., Хил Алуха Х. ; под ред. В. В. Краснопрошина, Н. А. Лепешинского. – Минск : Вышэйшая школа, 1993. – 162 с.

**Краснопрошин, В. В.** Интеллектуальный анализ программных аномалий / В. В. Краснопрошин, А. И. Наумович // Вестник Брестского государственного технического университета. Серия: Физика, математика, информатика. – 2020. – № 5. – С. 21–25 : ил.

**Краснопрошин, В. В.** Принятие решений в оперативных задачах регионального управления / Краснопрошин В. В., Виссия Х., Вальвачев А. Н. // Таврический вестник информатики и математики. – 2008. - № 1. - С. 267-273.

**Гафуров, С. В.** Программная технология построения систем для решения задач распознавания со сложной структурой / С. В Гафуров, В. В. Краснопрошин // Искусственный интеллект. - 2008. - № 1. – С. 30-37.

**Krasnoproshin, V.V**. Problem of Research Automation when Solving Face Detection and Recognition Task / Krasnoproshin V.V., Koblov E.V. // Искусственный интеллект. – 2006. - № 4. - С .641-650.

**Краснопрошин В. В**. Применение модели Шеннона-Уивера для задачи коммуникации в системах основанных на знаниях / Краснопрошин В. В., Вальвачев А. Н., Шаках Г. // Инфоматика. – 2005. - № 1. - С. 52-57.

### *Аб жыцці і дзейнасці В. У. Краснапрошына*

**Краснопрошин Виктор Владимирович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 507.

**Памятныя** даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем. 75 гадоў з дня нараджэння **В. У. Краснапрошына** (1947) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 51.

**Краснапрошын Віктар Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын, 2020. – С. 75-76 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Краснопрошин Виктор Владимирович** : [к 70-летию доктора технических наук, профессора] // Журнал Белорусского государственного университета. Математика. Информатика. - 2018. - № 1. - С. 107–108.

Кобрын
Краснапрошын Віктар Уладзіміравіч
Матэматыкі
Інфарматыкі
Прафесары